# Кампанію Зюзі не абяцаю...

## Топ-3 месцаў, якія варта наведаць з сям'ёй узімку

**Наперадзе па курсе — Каляды, Новы год і зноў Каляды. Куды падацца, каб падтрымаць, захаваць і ўзмацніць адпаведны настрой? Кампанію Зюзі не абяцаю, прапаную альтэрнатыўнае нечаканае.**

### Падарожжа першае: з гадзіннікам

Новага года без гадзінніка не бывае — раз, пад Новы год павінны адбывацца цуды — два. Кіруючыся гэтымі неабвержнымі ісцінамі, прапаную наведаць... Полацкі езуіцкі калегіум. Адкрыты ў 1581 годзе як навучальная ўстанова, ён і сёння ёю застаецца — цяпер гэта Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. Гэта значыць, не музей. Але вось спускаецца па чыгуннай лесвіцы стомлены навукамі студэнт. Ён добра ведае, што гэта лесвіца памятае падэшвы школяроў і выкладчыкаў XIX стагоддзя, — і мо якраз зараз перабірае ў галаве, чые дакладна падэшвы яна памятае. Увогуле, у гэтых сценах (фрагменты якіх у некаторых аўдыторыях спецыяльна пакінуты вачам і рукам даступнымі) вучыліся Ян Баршчэўскі і Валенцій Ваньковіч, выкладалі Марцін Пачобут-Адляніцкі і Габрыель Грубер. Апошні — астраном, інжынер, матэматык — прыбыў у Полацк у канцы XVIII стагоддзя чытаць археалогію і механіку. Гэта быў амаль Леанарда да Вінчы, што пасяліўся на нашай зямлі. Сканструяваная ім механічная галава апісана ў «Жывапіснай Расіі» — зборы «зразумелых кожнаму карцін жыцця нашай айчыны цяперашняга і мінулага». «Высока ў сцяне, — піша «ЖР», — амаль пад столлю ўстаўлена была галава старца з доўгімі сівымі валасамі. Рухомая, з вачыма, якія прымалі розныя выразы, і галоўнае — гаворачая на ўсіх ужывальных мовах. Галава гэтая, зразумела, прыводзіла ў недаўменне, захапленне і ў той жа час выклікала страх». Мінулай вясной у адну са сцен універсітэта-калегіума, акурат пад самай столлю нанова ўстаўлена галава сівога старца. Твар яго даволі прывабны, вочы — добрыя, пагляд — лагодны, але калі гучыць у пустым памяшканні з драўлянымі лавамі яго голас, адчуваеш, як і тыя, хто некалі тут бываў, недаўменне, захапленне і — так, менавіта страх: тую яго форму, якая не ёсць паніка, а ёсць нешта ўрачыстае, велічнае. Між тым, спытаць у старца, што чакае нас у 2017-м, — справа вартая.



Мінулай вясной у адну са сцен універсітэта-калегіума, акурат пад самай столлю, нанова ўстаўлена галава старца.

А вось у чытальнай зале купка адоранай моладзі рыхтуецца да канферэнцыі. Чытальная зала — на месцы сябе самой з часоў езуітаў, з XVI стагоддзя, яшчэ Пётр Скарга як першы рэктар усталяваў тут такі парадак — каб кнігі былі даступныя пры першай жа неабходнасці. Пісьмовыя сталы сучасныя, стэлажы таксама, але варта зірнуць на сцены і столь, каб не толькі зразумець да канца ўвесь сэнс старога выказвання: «Тут жывуць мёртвыя, тут размаўляюць нямыя» — але і адчуць яго праўдзівасць скурай.

У дворыку — калодзеж XVIII стагоддзя. Ваду з яго не п'юць — па-першае, застаялася, па-другое, лічыцца, што праз гэты калодзеж можна некуды трапіць. Як у казцы братоў Грым «Спадарыня Мяцеліца», не інакш.

У адной са сцен, што глядзяць у той дворык, усталяваны гадзіннік. Ведаеце, які час? XXI стагоддзе! З 2011 года ён, заўзята співаючы: «Gaudeamus i-gi-tur, juvenes dum su-u-mus!» — адчыняе пад сабою дзверы і прапускае ў іх па чарзе Еўфрасінню Полацкую, Францыска Скарыну, Пятра Скаргу, прафесара і студэнта. І тэбра вам гэта бачыць, тым больш што згаданая ВНУ, асняшчаная парталамі ў неймаверна легендарнае мінулае, працуе і як музей: экскурсійныя праграмы і кошты білетаў паведамляюцца на сайце.



«Gaudeamus igitur, juvenes dum sumus!» — пад гэтыя словы гадзіннік прапускае па чарзе ў свае дзверы Еўфрасінню Полацкую, Францыска Скарыну, Пятра Скаргу, прафесара і студэнта.

### Падарожжа другое: а-ля квэст

Кіньце вокам на карту Мінshчыны, адзначце каля Івянца вёску Рудня. За тры кіламетры ад яе, паміж Налібоцкай пушчай і Іслачу знойдзецца ўрочышча Вялае. Само яно, праўда, не знойдзецца — трэба яго шукаць, і гэты пошук можна вельмі проста ператварыць у квэст (каб, прынамсі, ніякія рэплікі свавольнага навігатара не маглі сапсаваць настрой, а толькі ўзмацнілі загадкавасць). Згодна з яго ўмовамі належыць найперш адшукаць на вуліцах старэнькага, як пячатка Вітаўта, Івянца адзін вельмі прыгожы касцёл. Улічваючы, што Івянец мае два касцёлы, і абодва прыгожыя, шукаць трэба той, у абліччы якога прагглядаецца віленскае барока. Западозрыць будынак у прыналежнасці да віленскага барока нескладана: як толькі заўважыце, як з яго «выплюхваецца кінетычная энергія», як толькі падасца, што будматэрыял «размяк і паплыў», — ведайце: віленскае барока. Знайшоўшы яго сімвал у Івянцы, убачыце рэчку, якая ціхенька дрэмле. Павярніце за ёю ў той бок, у які раіць паварочваць камень на казачнай ростані, каб не страціць сябе. Пасля звярніце па ўказальніку на санаторый «Лясное». Даехаўшы да яго, пакіньце «каня» (бо і на камені было сказана, што вы яго «страціце») і прайдзіце паўтары сотні метраў пешкі да сцен паляўнічага дома графа Тышкевіча. Стоячы перад ім, вы адчуеце, як праз падэшвы прабярэцца ў бок сэрца штосьці невымоўнае. І вось вы ўжо трапляеце на пэўную колькасць гадоў назад...

Толькі-толькі прыжылася ў Еўропе новая вынаходка — сепаратар для аддзялення вяршкоў. Цяпер снеданак з французскімі рагалікамі нашмат смачнейшы, бо масла да іх падаецца не з кісlінкаю, а салодкае. Яно лепш спалучаецца з сырам, які рэгулярна дастаўляецца сюды з Гарадзеі або Негарэлага ў галоўках памерам з каціную. Сыр гэты не горшы за эдамскі. Прынамсі, такі самы жоўценькі і пікантны.



Ключ да квэста. Віленскае барока — гэта калі кінетычная энергія рвецца з будыніны вонкі, або калі цэгла размякчаецца і плыве.

**Святла свечкі хапае на тое, каб бачыць на крок наперад, ніяк не болей, і нават вышыні скляпенняў у паўцемры ніяк не адчуць, і гэта здаецца тут напярэдадні Свята зусім ужо сімвалічным.**

Паснедаўшы рагалікамі з маслам і сырам, запіўшы іх гарбатаю з саксонскіх філіжанак, гаспадары і госці апранаюць футры і, пакінуўшы цёплы дом, усядаюцца ў нізкія санкі. Прыслуга клапатліва накрывае кожнага авечай шкурай, прышпільваючы яе да санак, — і вось ужо мчыцца па іскрыстым снезе вясёлае паляванне. Трубяць ражкі, звіняць званочкі... Ты чуеш, чытач? Ты чуеш? Ці чуеш толькі вецер, які гуляе ў напаўразбураных сценах? Я завяла цябе сюды, каб ты, набраўшы ў боты снегу, адчуўшы няўтульнасць маўклівай прасторы, вярнуўшыся пасля ў «цывілізацыю», не адзін яшчэ раз са шчаслівай усмешкай успомніў, як быў сведкам графскага палявання напярэдадні Светлых Каляд, і душа твая разгарнулася ад прыгажосці прыроды і нашай спадчыны, убіраючы ў сябе нашмат болей, чым бачаць вочы.

### Падарожжа трэцяе: больш глыбокае

Больш глыбокае — бо ў Глыбокае. І не толькі метафарычна так, але і ў самым прыземленым (нават падземным) значэнні. Глыбоцкі кафедральны сабор Ражства Прасвятой Багародзіцы (наконт якога, кажуць, надта ж бедаваў Напалеон — што не можа ўзяць яго з сабой у Парыж: быў бы, маўляў, добрым кампаньёнам тамтэйшаму Нотр-Даму) мае глыбокія сутарэнні, трапіць у якія можна, раскрыўшы драўляныя створкі адразу пры ўваходзе ў храм. Папярэдне, праўда, трэба набыць свечкі, пажадана самыя тоўстыя — каб свяцілі ярчэй і даўжэй, а таксама атрымаць найсвяцейшы дазвол на перамяшчэнне ўніз па каменных прыступках — у глыб прамінулых стагоддзяў. Сабор належаў некалі манастыру кармелітаў, і гэтыя сутарэнні, кажуць, цягнуліся аж да суседняга Беразвечча.



Глыбоцкі кафедральны сабор Ражства Прасвятой Багародзіцы, наконт якога бедаваў Напалеон — што не можа ўзяць яго з сабой у Парыж, — мог быць добрым кампаньёнам тамтэйшаму Нотр-Даму.

Святла свечкі хапае на тое, каб бачыць на крок наперад, ніяк не болей, і нават вышыні скляпенняў у паўцемры ніяк не адчуць, і гэта здаецца тут напярэдадні Свята зусім ужо сімвалічным: ніхто не можа бачыць вышэй за самога сябе, ніхто не можа ведаць, што чакае наперадзе. Ніхто, акрамя Бога, да якога цяпер бліжэй, чым калі...

Адзін мудрэц з Глыбоччыны 1 студзеня 1932 года запісаў у дзённіку: «Прыйдзі, Новы годзе, і не крыўдзі мяне мэндзай-бядою так, як папярэднія — старыя... Прынясі мне добрыя памысныя варункі жыцця дзеля маёй працы на карысць людзям...» Гэта Язэп Драздовіч, які «сам зварыў сабе есці» і піша — заканчвае падарожжа «На Арыяполь».

**Падарожнічала Святлана ВОЦІНАВА.**

### ДАЛЁКА І БЛІЗКА

У Літве 23 снежня — свята Блукаса. У гэты дзень яго, Блукаса, спаляць — як сімвал недавершаных спраў і няспраўджаных спадзяванняў. Блукас — стары пень, літаральна і метафарычна. Як толькі спаляць яго, закацііўшы папярэдне ў кожны двор, дык і Новы год неўзабаве прыйдзе. Бо толькі пасля спальвання Блукаса дзень пачынае павялічвацца, паварочваць на вясну, а з ёю, вясною, прыходзяць і новыя справы, і новыя спадзяванні. Хочаце трапіць на Свята Блукаса? Вам у літоўскую вёску.



**Калядны кірмаш на Елагіным востраве ў Санкт-Пецярбургу адкрыецца заўтра і будзе працаваць да канца студзеня. Па-першае, варта наведаць тамтэйшы палац — ён шэдэўральны, па-другое, набыць сабе і родным рукавіц-шкарпэтак-шапак-шалікаў, звязаных рукамі з любоўю і радасцю, па-трэцяе, пакаштаваць імбірных пернікаў з гарачым глінтвейнам, па-чацвёртае, пакоўзацца на каньках, па-пятае, набыць сувеніраў і ўпрыгажэнняў для ялінкі. Нагадаў, інакш кажучы, хапае.**

Тым, каго непакояць лаўры дабрака Санты настолькі, што хочацца яго замяніць, прапануюцца спецыяльныя майстар-класы. У Санту іх не ператвараюць, але вучаць запакоўваць падарункі так, як гэта робіць ён. Каб наведаць такі майстар-клас, трэба трапіць у Капенгаген да 31 снежня. Каго ў нас непакояць лаўры Санты?



**Найлепшыя цацкі для ялінак — ручной работы. Найлепшыя ялінкавыя цацкі ручной работы — чэшскія. Найлепшыя з чэшскіх ялінкавых цацак ручной работы — выстаўлены на калядным кірмашы ў старой Празе, на Старамесцкай плошчы. Вы спытаеце пра тамтэйшыя прысмакі. На Каляды ў Чэхіі выпякаецца шмат што — ад штоленаў-кексаў да пернічкаў і рагалікаў, усё ў навагоднім дызайне і смаку.**

Кажуць, у Варшаве падчас навагодніх кірмашоў пах глінтвейну змешваецца з пахам цукру, падсмажанага спецыяльна для булачак, якія пякуцца літаральна на вачах у ласуноў. Кажуць, там яшчэ шмат рознага смачнага, і ад пагляду на гэтае смачнае душа ператвараецца ў суцэльнае карамельна-ванільна-мядовае (ёсць варыянты) шчасце. Можа, паехаць туды хоць на дзень? Булачкі з навагоднім настроем будуць пячыся да 8 студзеня. Месца — Рынкавая плошча.



**Калядны кірмаш у Валькенбургу (Нідэрланды) не зусім звычайны. Гэта і кірмаш, і аднчасова атракцыён. Ладзіцца не на плошчы, а літаральна ў пячоры, размешчанай пад руінамі замка. Вось чаго, здаецца, яшчэ не хапае душы, стомленай у пошуках прыгод пад Новы, 2017-ы, вельмі шчаслівы год.**